№ 62 (4007)

11 жніўня 2015 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

www.nv-online.info

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Пахаладае!

Сёння і ў сераду па краіне да +32...+34. А вось з серады па прагнозах сіноптыкаў спёка спадзе, установіцца камфортнае надвор'е: ад +23...+25 у Мінску і Магілёве да +26 у Гомеле, Гродне і +28 у Брэсце. Хочацца верыць, што сіноптыкі не памыляюцца.

ВЫБАРЫ–2015

Колькі вас, прыхільнікаў прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь?

Ад «Народнай Волі»

Афіцыйная прэса ўсяляк падхвальвае ініцыятыўныя групы прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта, маўляў, глядзіце, прыхільнікі А.Р.Лукашэнкі сабралі ўжо больш за 500 тысяч подпісаў, Цярэшчанкі – 105.000, Гайдукевіча – больш за 100.000. Зразумела, дрэнна ідуць справы ў тых, хто ні за якія грошы не стане спарынг-партнёрам галоўнага прадстаўніка ўлады – скажам, у лідара Грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі альбо ў старшыні партыі "Справядлівы свет" Сяргея Калякіна.

А калі сур'ёзна паглядзець на той жа збор подпісаў? Пакуль усе паперы не трапілі на стол выбарчых камісій, лічбы можна называць любыя, як кажуць, нават са столі. І няхай гэта застаецца на сумленні тых, хто, магчыма, святую справуператварае ў поўны абсурд. Гэтыя словы аднолькава можна аднесці і да тых асоб, хто будзе абавязаны пазней дасканальна праверыць сапраўднасць подпісаў, якія пададуць ініцыятыўныя групы прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта, але, не выключана, заплюшчыць вочы на фальсіфікацыі некаторых палітыкаў, якіх не столькі хвалюе лёс Беларусі, колькі ўласныя інтарэсы.

"Народная Воля" ўчора ў чарговы раз адправіла на дзве гадзіны некалькі журналістаў у месцы збору подпісаў, каб увачавідкі пераканацца, як на самай справе людзі выказваюць сваю прыхільнасць таму ці іншаму прэтэндэнту на пасаду прэзідэнта.



Пікет за Цярэшчанку: два подпісы за дзве гадзіны

Збор подпісаў на пікеце ля сталічнага ўніверсама "Цэнтральны" за Віктара Цярэшчанку.

12.00 Дзяўчаты, якія збіраюць подпісы, распавядаюць, што прыйшлі сюды прыкладна ў 11.00, а за гадзіну падпісаўся ўсяго адзін чалавек.

12.06 Першы чалавек, які падчас майго назірання падышоў пачытаць біяграфію патэнцыяльнага кандыдата. Ціха пачытаў і ціха сышоў.

12.12 Ніхто не падпісваецца, зато з'явіўся нейкі невялікі начальнік з ініцыятыўнай групы па зборы подпісаў. Дае парады зборшчыкам подпісаў, на ўсялякі выпадак паказвае мне сваё пасведчанне.

12.13 Подпіс за Віктара Цярэшчанку ставіць мужчына сярэдніх гадоў, які пры гэтым тлумачыць свой выбар крыху незразумела: "Даўно шукаў, спецыяльна хадзіў... Хоць, мяркую, другі раз ісці на выбары не варта..."

12.20 Бабуля чытае біяграфію Віктара Цярэшчанкі, пасля чаго ўдакладняе ў зборшчыцы подпісаў: "Дык дзе ён працуе?" – "У фірме, з медыцынай звязана..." – "Прыватная?" – "З абмежаванай адказнасцю". – "О, гэта вы ў яблычак! Усе яны – з абмежаванай адказнасцю..."

І бабуля сыходзіць...

13.00 За 40 хвілін ніводны чалавек нават не падышоў да пікета.

13.04 Прачыталі біяграфію Цярэшчанкі два пенсіянеры. Хоць нейкая "актыўнасць".

13.21 Жанчына вырашыла паставіць подпіс за Цярэшчанку, а затым і за Таццяну Караткевіч. "За Лукашэнку могуць і прымусіць падпісацца, а гэтым людзям трэба дапамагчы", – кажа яна.

14.00 Ізноў 40 хвілін поўнай цішыні. Такім чынам, за дзве гадзіны за Віктара Цярэшчанку падпісаліся два чалавекі.

Алесь СІВЫ.

«Горш ужо не будзе..."

Пікеты ініцыятыўнай групы Сяргея Гайдукевіча звычайна стаяць ля ГУМа і ЦУМа. Я выправілася да ГУМа.

11.55 Тут стаяць пікеты за Караткевіч і Цярэшчанку. Пікета за Гайдукевіча няма.

12.15 Нікога з прадстаўнікоў ініцыятыўнай групы Гайдукевіча так і не з'явілася на сваім пастаянным месцы.

12.20 У перадвыбарным штабе патэнцыяльнага кандыдата сцвярджаюць, што "*дакладнай інфармацыяй пра месцазнаходжанне сваіх пікетаў валодае толькі Сяргей Васільевіч асабіста*".

12.30 Тэлефаную Сяргею Гайдукевічу. Першапачаткова на пытанне ці будзе сёння адбывацца збор подпісаў за яго вылучэнне ў кандыдаты, Гайдукевіч адказаў: "*Не, бо мы ўжо сабралі больш за 100 тысяч подпісаў і прымушаць працаваць нашых людзей у гэткую спёку не хочам. Мы паказухай не займаемся*". Але пасля дадаў, што "*хвілін праз 40, можа, хто і пад'едзе*"...

13.10 Прайшоў час, і ніхто з паплечнікаў Гайдукевіча да ГУМа не пад'ехаў. Паўторна звязваюся са штабам – адказу няма.

13.15 Паступае тэлефонны званок ад прадстаўніка ініцыятыўнай групы, які назваўся Аляксандрам. "*Я прыеду на пікет у 16 гадзін. І сёння ва ўсім Мінску гэта будзе адзіны пікет за Гайдукевіча*", – запэўніў Аляксандр.

16.00 Ля ГУМа ўсталяваны інфармацыйны стэнд ЛДП. "*Больш подпісаў збіраецца, калі ходзіш па кватэрах. А тут – 50–60 за дзень. Мы ўжо сабралі неабходную колькасць і цяпер проста інфармуем людзей, гэта ў пэўнай ступені сімвалічны акт*" – распавядае Аляксандр. Побач з ім стаіць дзяўчына, таксама член ініцыятыўнай групы Гайдукевіча. Па іх словах, абодва ўжо пяць гадоў з'яўляюцца сябрамі і актывістамі партыі.

16.15 Да стэнда падышла жанчына ў гадах – першы подпіс на пікеце ёсць. Людзі глядзяць у бок стэнда, але праходзяць міма. Адзінкі спыняюцца, каб запытаць, ці сябруе Гайдукевіч з Жырыноўскім.

16. 20 Побач з пікетам ЛДП усталёўвае свой стэнд Жанна Раманоўская, адначасова даючы каментарый журналісту-фрылансеру. Яна сама стаіць у пікеце і асабіста збірае подпісы за ўласнае вылучэнне.

16.30 Ініцыятыўная група Сяргея Гайдукевіча і Жанна Раманоўская абмяняліся подпісамі. "*Я падтрымліваю ўсіх, я ўсіх люблю*!" – каментуе прэтэндэнтка ў кандыдаты. На пытанне, як яна ацэньвае свае шанцы, Раманоўская адказваць адмовілася.

16.40 Пажылы мужчына пакінуў подпіс за Гайдукевіча. Гэты выбар ён матывуе тым, што "*горш,чым ёсць, ужо не будзе*", і дадае: "*Маім галоўным патрабаваннем да выбараў як грамадзяніна Беларусі было б відэаназіранне за падлікам бюлетэняў...*"

16.45 Да пікета падышоў заслужаны артыст Беларусі Руслан Мінін і пакінуў подпіс у падтрымку Гайдукевіча.

16. 50 Прадстаўнік ініцыятыўнай групы Аляксандр паказаў Мініну сваё пасведчанне ЦВК. Чамусьці на вокладцы беларускага пашпарта прыхільніка ЛДП – расійскі герб і надпіс з цісненнем – "Россия"...

Кацярына АНДРЭЕВА.

«Я ўжо выбрала свайго адзінага»

Пляцоўка побач з ГУМам. Побач з цэнтральным уваходам свае подпісы за **Таццяну Караткевіч** збіраюць два актывісты з кампаніі "Гавары праўду!".

12.07 Да пікета падыходзіць жанчына ў джынсавай сукенцы. Падпісацца не можа: толькі здала пашпарт у пасольства. Але неўзабаве дастае з сумкі раздрукаваную анкету, адкуль дыктуе пашпартныя дадзеныя.

12.19 Жанчына, якая падышла да стэнда, адмаўляецца падпісвацца. *"Я ўжо выбрала свайго адзінага"* (праўда, каго менавіта, казаць адмаўляецца).

12.20 Побач з пікетамі за Караткевіч збіраюць галасы за **Віктара Цярэшчанку.** Адна з мінчанак спачатку ставіць подпіс за эканаміста, потым за кандыдата "Гавары праўду!". У нейкі момант актывіст гэтай арганізацыі нават заклікае: *"Падтрымайце кандыдатаў. Нас тут двое!".* Але за дзве гадзіны свае подпісы і за таго, і за другога кандыдата паставяць каля пяці чалавек.

12.35 Жанчына, што шпацыруе па праспекце, бачыць бел-чырвона-белы сцяг, накінуты на плечы актывіста "Гавары праўду!", спыняецца і ставіць подпіс. Хлопец гадоў дваццаці двух апрануты ў вышыванку. Сцяг ён не ўсталяваў, бо не хапае вуды. Ён агітуе па-беларуску і прываблівае свядомую аўдыторыю.

12.40 Яго калега, жанчына гадоў сарака пяці-пяцідзесяці, заклікае галасаваць па-руску. Яна арыентуецца на жанчын сярэдняга і сталага веку і робіць акцэнт на асабістых якасцях кандыдаткі ("спартсменкі і прыгажуні") і гендарным аспекце: *"Галасуйце за адзіную жанчыну!"* (як бачна, **Жанна Раманоўская** ўсур'ёз не ўспрымаецца). Такія заклікі прыносяць з дзясятак подпісаў: шэраг жанчын спыняюцца і ўважліва вывучаюць стэнд.

12.46 *"Прэзідэнтам павінен быць мужчына!",* – упэўнена кажа жанчына, што падышла да стэнда. *"А мы, ля пліты павінны стаяць?",* – адразу ўключаецца ў дыскусію актывістка "Гавары праўду!". *"Так мы нават самалётамі кіруем",* – у мінчанцы прачынаецца жаночая салідарнасць. "Мы ж не ў чадры!", – трыумфуе актывістка. Подпіс атрыманы.

12.53 Падыходзіць жанчына і ўважліва чытае біяграфію Караткевіч. Потым расчаравана кажа: *"Дык яна таксама псіхолаг, як і я".* Свой подпіс патэнцыяльны кандыдат не атрымлівае.

13.15 Да пікета падыходзіць апазіцыянер са стажам: *"Трэба было раней пачынаць кампанію! Яна ж нічога пра сябе не расказала і не напісала. Вунь Лябедзька друкуецца з артыкуламі ў "Народнай Волі". А Караткевіч?".* Сыходзіць, не падпісаўшы.

13.21 Свой подпіс пакідае жанчына са Смалявіч. Дагэтуль былі выбаршчыкі з Жодзіна і Салігорска. У астатніх – мінская рэгістрацыя.

13.32 Сталая жанчына, якая ставіць свой подпіс, адзіная, хто просіць расказаць біяграфію Караткевіч. Размова зацягваецца хвілін на дзесяць.

13.50 Падыходзіць мужчына, які просіць паразмаўляць з самой Таццянай. Яму пакідаюць візітоўку з усімі кантактамі.

13.52 Свой подпіс за Караткевіч пакідае апошнія за гэтыя дзве гадзіны кандыдат – моцна накачаны хлопец з татуіроўкамі на плячы. Агулам за дзве гадзіны свае подпісы паставілі 24 чалавекі. Пераважная большасць з іх – жанчыны сталага ўзросту, на якіх (калі меркаваць па знешнім выглядзе) трымаецца ўся гаспадарка.

Максім ПЛОТНІКАЎ.

РЭГІЁН

«А што мне дадуць, калі я падпішуся?..»

Карэспандэнт "Народнай Волі" паназіраў, як збіраюць подпісы за прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду ў Наваполацку.

Пакінуць свае подпісы за кандыдата ў прэзідэнты ў Наваполацку можна ля гандлёвага цэнтра "Пралеска" і ўніверсама "Дзвіна".

Каля "Пралескі" недалёка адзін ад аднаго працуюць ініцыятыўныя групы Таццяны Караткевіч і Аляксандра Лукашэнкі.

Каардынатар збору подпісаў па Наваполацку за Таццяну Караткевіч Антон Ясіновіч гучна запрашае падтрымаць яго кандыдата.

– *Людзі падыходзяць, але не так шмат, як хацелася б,* – распавядае "Народнай Волі" Антон Ясіновіч. – *Сярэдні ўзрост 30–50 год рабочы клас, адным словам...*

Антон выбачаецца, перарывае размову і прапануе жанчыне ў белым сарафане пакінуць подпіс за Таццяну Караткевіч. Хвіліна сумнення, і навапалачанка дастае з сумачкі пашпарт, накіроўваецца да століка прыёму подпісаў.

– *Вось так і працуем,* – вяртаецца да размовы Антон. – *Ёсць тыя, хто і падпісацца гатовы, але дакумента няма, праўда, шмат хто ідзе дахаты, а потым вяртаецца.*

– **Моладзі шмат падыходзіць?** – цікаўлюся ў Антона Яхімовіча.

– Час ад часу з'яўляецца, аднак актыўнасць невялікая. Разлічвалі на студэнтаў, але ж лета...

– **З канкурэнтамі не сварыцеся?** – паказваю на зборшчыкаў за Аляксандра Лукашэнку.

– З імі сітуацыя цікавая адбываецца. Як толькі мы прыязджаем на месца, праз хвіліну і яны за намі...

Падчас размовы назіраю, як дзве падобныя на студэнтак дзяўчаты падпісваюцца за Таццяну Караткевіч. Пытаюся, чаму менавіта такі выбар?

– *Жаночая салідарнасць,* – ці то жартам, ці то ўсур'ёз адказваюць дзяўчаты. – *Мы чыталі яе інтэрв'ю ў інтэрнэце, разумныя рэчы гаворыць. Хто ведае, можа, ёй пашанцуе...*

Следам за дзяўчатамі да кропкі за Таццяну Караткевіч набліжаюцца двое мужчын нападпітку з гарэлкай у руках. Пытаюцца, а што дадуць, калі пакінуць подпіс за жанчыну-кандытата? Хлопцы з ініцыятыўнай групы ветліва тлумачаць, што ў іх тут не крама, і тыя сыходзяць...

Прачытаўшы біяграфію Караткевіч некалькі разоў, я накіроўваюся да зборшчыкаў подпісаў за Аляксандра Лукашэнку. Маладыя дзяўчаты спакойна сядзяць за століком.

– **Чаму на плакатах іншых кандыдатаў ёсць біяграфічныя звесткі, а ў вас няма?** – ветліва пытаюся ў маладых дзяўчат.

– *Таму што не мы рабілі гэты білборд,* – таксама ветліва адказвае адна са зборшчыц подпісаў. – *Аляксандр Лукашэнка наш прэзідэнт з 1994 года і, напэўна, усе ведаюць яго біяграфію, а калі не, то можна паглядзець у інтэрнэце.*

– **Я па тэлевізары чуў, што ў вашага любімца ўжо даўно ёсць 100 тысяч подпісаў...**

– Так, але па законе кампанія доўжыцца да 21 жніўня, таму будзем яшчэ працаваць.

Раман ВАСЮКОВІЧ.
Наваполацк.

Пікет-фантом

На ўнутрырэдакцыйнай лятучцы атрымаў заданне: папрысутнічаць на пікеце і зрабіць маніторынг збору подпісаў за лідара Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзьку.

Справа здавалася прасцей не прыдумаеш, бо лозунгам гэтай прэзідэнцкай кампаніі прэтэндэнт у кандыдаты ад АГП абраў наступны: **«Выбараў у Беларусі няма, але выбар – ёсць».** З гэтага быццам бы лагічна вынікае: маеце альтэрнатыву – рэкламуйце сябе ў кожным завуголлі.

Што ж у выніку?

Адрасы і час пікетавання сябраў ініцыятыўнай групы Анатоля Лябедзькі абнаўляюцца штодня на партыйнай інтэрнэт-старонцы. У панядзелак, 10 жніўня, адной з такіх кропак павінна была стаць тэрыторыя ля сталічнага ЦУМа. Быў заяўлены і час пікетавання – з 12.00 да 20.30.

Званю каардынатару ініцыятыўнай групы Анатоля Лябедзькі Вользе Маёравай, каб спраўдзіць час. І тут высвятляецца, што пікет ля ЦУМа замест заяўленых 12 гадзін дня пачнецца ў 14.00.

У вызначаны час я ўжо каля Цэнтральнага ўнівермага. Але зборшчыкаў подпісаў за Лябедзьку не назіраю.

14.10 Ніхто не з'явіўся.

14.20 Тая ж карціна. Прадстаўнікі каманды Анатоля Лябедзькі пікет так і не разгарнулі.

14.30 Пачынаю хвалявацца. Можа, што здарылася? Надвор'е вунь якое – ад спёкі асфальт плавіцца. Хаця лагічна разважаю: ну не можа ж адначасова гарачыня дрэнна паўплываць на ўсю ініцыятыўную групу.

Дарэчы, заўважаю, што на людным месцы каля ЦУМа няма пікетаў ніводнага магчымага апанента Лукашэнкі. А вось подпісы за кіраўніка краіны збіраюць актывісты «Белай Русі».

16.30 Прадстаўнікі Лябедзькі каля ЦУМа так і не з'явіліся. Чакаю зборшчыкаў подпісаў яшчэ некалькі хвілін і еду ў рэдакцыю – час здаваць матэрыял у нумар.

Ужо з рэдакцыі звязваюся з офісам АГП. І чую ў адказ: аказваецца, актывіст, адказны за пікет каля ЦУМа, захварэў.

Каментарыі, як кажуць, залішнія...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

УЧОРА

«Маем намер падпісаць паўтара дзясятка дакументаў»

У Беларусі з афіцыйным візітам знаходзіцца прэм'ер-міністр Пакістана Наваза Шарыфа. Учора ён прыляцеў у Мінск, дзе затрымаецца да 12 жніўня.

Што чакаць ад гэтага візіту?

Агенцтва БЕЛТА цытуе Аляксандра Лукашэнку: *"Мы маем намер па выніках перамоў падпісаць паўтара дзясятка дакументаў*". Вядома, што кіраўнік урада Пакістана пабывае на некалькіх машынабудаўнічых прадпрыемствах, прачытае лекцыю ў БДУ, дзе яму ўручаць дыплом ганаровага прафесара, а сёння ён разам з Аляксандрам Лукашэнкам адкрые беларуска-пакістанскі бізнес-форум.



Эканаміст цэнтра "Стратэгія" Леанід Заіка лічыць, што эканамічных выгод, на якія разлічваюць беларускія ўлады, ад гэтага візіту чакаць «проста смешна».

"Пра што марыць звычайны пакістанскі чыноўнік? Закупіць шмат трактароў. А чым ганарацца беларусы? Трактарамі. Спробы прадаваць іх туды пачыналіся яшчэ падчас прэм'ерства Чыгіра. І ўсе яны пры ўсіх іншых прэм'ерах праваліліся. Пакістанцы гатовы былі плаціць такія невялікія грошы, што нам такі гандаль прыносіў бы адны страты. Таму гэта бясплённае „танга з трактарамі" будзе толькі працягвацца, – заявіў Заіка Радыё Свабода. – А ў цэлым супрацоўніцтва паміж Ісламабадам і Мінскам ідзе паводле ідэалогіі краін трэцяга свету. Гэта – лёгкая прамысловасць, прадукты харчавання, сельская гаспадарка".

Ігар ЗАЛЕСКІ.

ВІНШУЕМ!

Мікалаю Статкевічу – 59!



У Мікалая Статкевіча 12 жніўня Дзень народзінаў. Гэта ўжо пяты дзень народзінаў, які палітык будзе адзначаць за кратамі. Ён адзіны з прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта кампаніі-2010, які дагэтуль знаходзіцца пад вартай.

Днямі кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў, што дата выхаду Статкевіча на волю цалкам залежыць ад яго волі. Прынамсі, "Еўрарадыё" ён сказаў: *«Я не стану хітраваць, гэтае пытанне на парадку дня. Вырашыць гэта магу толькі я. Але я не вызначаўся, калі гэта будзе. Я гэтае пытанне ў такім ключы не разглядаў. Калі яго выпускаць, то выпускаць да выбараў. Калі не выпускаць, то не выпускаць. У бліжэйшы час вы будзеце пра гэта ведаць. Калі іншы варыянт, то часу шмат «.*

Мікалай Статкевіч не падаваў прашэння аб памілаванні, і гэтае рашэнне для палітыка з'яўляецца прынцыповым, нягледзячы на ўсе выпрабаванні. Натуральна, такая мужная пазіцыя не можа не бянтэжыць кіраўніцтва краіны. Аляксандр Лукашэнка з'едліва заявіў: *«Ён хоча быць у турме і выйсці адтуль героем. Я яму даю такую магчымасць, а вы кажаце – выпусціць. І што мне рабіць? Я магу выпусціць, калі чалавек звернецца да мяне з прашэннем, але ён не звяртаецца, таму што хоча быць героем «.*

Патрабаванне вызваліць з-за крат Мікалая Статкевіча гучыць з самых розных трыбун. Сёлета ў ініцыятыўную групу па яго вылучэнні кандыдатам у прэзідэнты ўвайшло больш за 1500 чалавек.

...Нямала паштовак атрымае Мікалай на свой дзень народзінаў. "Народная Воля" далучаецца да віншаванняў і зычыць яму здароўя і хутчэйшага выхаду на волю!

Павіншаваць Мікалая Статкевіча можна па адрасе: 212011 г. Магілёў, вул. Крупскай, 99а, СТ-4.

Нагадаем: у маі 2011 года Мікалая Статкевіча пакаралі на шэсць гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі ўзмоцненага рэжыму па абвінавачанні ў арганізацыі масавых беспарадкаў 19 снежня 2010 года. Тэрмін пакарання Статкевіча заканчваецца ў снежні 2016 года. Міжнародныя арганізацыі прызналі Мікалая Статкевіча вязнем сумлення.

Любоў ЛУНЁВА.

СУД ДЫ СПРАВА

Мікалай АЎТУХОВІЧ: «Давялі-такі чыноўнікі да бальніцы...»

Былы палітвязень Мікалай Аўтуховіч патрапіў з гіпертанічным крызам у шпіталь.

17 ліпеня ў Ваўкавыскім раённым судзе разглядалася пытанне аб працягу мясцоваму прадпрымальніку і былому палітвязню Мікалаю Аўтуховічу прэвентыўнага нагляду, на якім настойвалі супрацоўнікі міліцыі. Суддзя апытаў прадстаўніка міліцыі, які непасрэдна ажыццяўляў нагляд за Аўтуховічам і той заявіў, што не мае да Мікалая ніякіх прэтэнзій. Прадстаўнік пракуратуры таксама выказаўся, што не бачыць падстаў для працягу нагляду. У выніку суд адмовіў органам Ваўкавыскага РУУС у падаўжэнні прэвентыўнага нагляду за Мікалаем Аўтуховічам.

Але, як аказалася, радавацца было рана. Выканаўца абавязкаў пракурора Ваўкавыскага раёна выступіў з апратэставаннем рашэння суда. Спачатку іск у суд быў на 6 жніўня, але пазней прынесці на новую дату – на 5 жніўня. І Гродзенская абласная калегія суддзяў пастанавіла падтрымаць пратэст пракурора.

"Я разумею, чаму пракуроры і судовыя работнікі так спяшаліся, – распавёў "Народнай Волі" Мікалай Аўтуховіч. – 6 жніўня ў мяне заканчваўся прэвентыўны нагляд, а "пракуроры" ці то былі ў адпачынку, ці то проста "праспалі". На судовай калегіі я прасіў, што за ўвесь час нагляду ў мяне было толькі адно парушэнне (з'ехаў з горада па справах фірмы), за якое выплачаны штраф, і якое 1 жніўня скасавана. Але і гэтага было дастаткова, каб калегія стала на бок пракуратуры. Я наогул не выключаю, што суддзі мяне могуць рыхтаваць нейкую новую правакацыю. Пагражалі ж, каб з'язджаў з краіны".

Пасля вынясення рашэння Мікола Аўтуховіч накіраваў скаргу на дзеянне адваката і судовай калегіі, яго чакаў новы суд. Але ў гэты дзень з самага ранку Мікалаю стала дрэнна з сэрцам, таму яго забралі ў шпіталь з гіпертанічным крызам.

"Здароўе – не жалезнае, – дадае Аўтуховіч. – Не вытрымаў арганізм тых нервовых нагрузак, што ўскладалі на яго ў апошнія дні. Давялі-такі чыноўнікі да бальніцы..."

У выніку прэвентыўны нагляд над Мікалаем Аўтуховічам працягнуты на паўгода. Такое рашэнне 6 жніўня было прынята на паўторным пасяджэнні суда Ваўкавыскага раёна, якое адбылося без удзелу Аўтуховіча.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

РЕАЛЬНАЯ ЭКОНОМИКА

Кризис продолжает раздевать «Милавицу»

Белорусы стали покупать меньше белья знаменитого отечественного бренда.

На белорусском рынке, который является одним из ключевых для эстонского холдинга SilvanoFashionGroup(SFG) и входящей в него «Милавицы», сохраняется отрицательная динамика продаж.

Как сообщается в отчете SFG, во втором квартале этого года белорусы купили белья на сумму 11,2 млн евро, что на 28% меньше, чем за аналогичный период 2014 года. В первом квартале продажи упали на 26,7%.

«В среднем мы видим меньше посетителей, а также средние покупки на меньшие суммы в розничном сегменте», – отмечается в отчете SFG.

До конца 2015 года холдинг планирует сделать упор на «консервативный рост в открытии магазинов и некоторое восстановление в розничном сегменте».

Динамика продаж SilvanoFashionGroup, одного из крупнейших в СНГ и странах Балтии производителя женского белья, стала своеобразным индикатором состояния на потребительских рынках этих регионов и экономики в целом.

Компания пока далеко до показателей даже прошлого года. Продажи в первом полугодии 2015 года составили 34,5 млн. евро, что на 36,9% меньше, чем за первую половину 2014 года. Чистая прибыль сократилась на 45,8% (до 8,5 млн евро), на 586 человек с начала года уменьшилось число сотрудников холдинга. Главные причины – замедление экономического роста, девальвация национальных валют, снижение покупательского спроса на основных рынках сбыта: в России, Беларуси, Украине, Казахстане, странах Балтии.

Николай АДАШКЕВИЧ.

ФІНАНСЫ

Сачыце за рэкордамі!

Сёння афіцыйны курс долара дасягнуў узроўню 15 805 рублёў. Гэта ўжо чацвёрты гістарычны максімум за 7 дзён.

На мінулым тыдні курс долара тройчы біў рэкорды: у аўторак Нацбанк усталяваў курс долара на ўзроўні 15.497 рублёў, у сераду – 15.565, у чацвер – 15.707. Да 4 жніўня гістарычным максімумам лічыўся ўзровень 15.488 рублёў за долар. Столькі амерыканскі "зялёны" каштаваў яшчэ 9 чэрвеня.

Таксама вырас курс еўра – з 17.149 да 17.327 рублёў.

Ад снежня 2014 года па люты 2015-га беларускі рубель быў дэвальвіраваны больш як на 40%: курс на 19 снежня складаў 10.890 рублёў за долар ЗША, а на 3 лютага – 15.450. Потым на працягу сакавіка–мая назіралася ўзмацненне нацыянальнай валюты, і долар нават знізіўся да 14.040. З 19 мая да 9 чэрвеня долар зноў вырас – на 1448 рублёў, але ў другой палове чэрвеня-ліпеня курс рубля стабілізаваўся. Некаторыя эканамісты сцвярджаюць, што хутка 1 долар будзе каштаваць 16 тысяч.

ЗАПРАШЭННЕ

Лукашэнку чакаюць у Львове

Мэр Львова Андрэй Садовы запрасіў Аляксандра Лукашэнку на матч Украіна – Беларусь, які пройдзе ў рамках кваліфікацыі на Еўра-2016.

«Звяртаюся з ініцыятывай, каб прэзідэнт Парашэнка запрасіў у Львоў на футбольны матч Украіна–Беларусь, які абудзецца 5 верасня, прэзідэнта Лукашэнку. Вельмі важна, каб кіраўнікі нашай краіны максімальна выкарыстоўвалі магчымасці Львова для правядзення міжнародных сустрэч, форумаў і канферэнцый», – сказаў Садовы.

Матч паміж зборнымі Украіны і Беларусі пройдзе ў Львове 5 верасня.



КРИК ДУШИ

«Уважаемый главный редактор газеты «Народная Воля»! Просим Вас оказать содействие в общественном освещении и донесении до президента и органов власти проблем, возникших у дольщиков долгостроя, расположенного в Минске по адресу ул. Волгоградская, д. 20...»

Вновь и вновь мы вынуждены обращаться к проблемам строительной отрасли, потому что этого требуют люди. Хотя официальные власти делают вид, что проблема давно решена.

Где искать правду?



Несмотря на грядущие выборы, несмотря на поручения президента, несмотря на обещания представителей власти, проблему долгостроев в Минске решить так и не удалось. За одним недостроенным домом «всплывает» второй, третий... Иногда кажется – как снег на голову властям.

Перед народом и президентом представители власти, однако, говорят, что проблемы нет (или почти нет). А перед нами, дольщиками, разводят руками и признают, что помочь ничем не могут (иной раз и вовсе отказываются даже принять и выслушать).

В подобной ситуации оказались и мы, дольщики одного из минских долгостроев по улице Волгоградской, 20 (рядом со станцией метро «Московская»), строительство которого было начато еще в 2009 году. По проекту здание представляет собой двухсекционный жилой дом с этажностью 16 и 19 этажей. Однако на сегодняшний день строительство не ведется и окончены лишь неполных четыре этажа первой блок-секции. Участок под строительство выделялся с обременением (снос жилого дома частного сектора с отселением 3-х семей). Несмотря на то, что судебные разбирательства по отселению семьи, часть дома которой препятствовала процессу строительства, были завершены в сентябре 2013 г., работы так и не были возобновлены.

На протяжении долгого времени власти в лице администрации Первомайского района, Мингорисполкома и Администрации президента не контролировали данный объект. Наши многочисленные коллективные обращения к органам власти, в том числе в Комитет государственного контроля и в прокуратуру игнорировались, либо на них давались формальные отписки, отличающиеся наименованием отправителя. До сих пор мы даже не получили ответа на вопрос, кто курировал строи- [illegible] продолжения строительства. Регулярные собрания в администрации Первомайского района Минска, которые проходят с февраля 2014 года и по сегодняшний день, не дали результата.

Со слов должностных лиц, принимавших участие в собраниях, нам, дольщикам, известно, что ООО «Волынь» не располагает денежными средствами, необходимыми для исполнения принятых на себя обязательств. Факт необъяснимый! Ведь условием заключения договоров с ООО «Волынь» было единовременное и стопроцентное внесение оплаты стоимости квартир (при заключении договоров) и получение бездокументарных жилищных облигаций на количество оплаченных «квадратных метров», срок обращения которых, к слову, истек 31 марта 2014 года.

Стоит также учесть тот факт, что не все дольщики являются владельцами жилищных бездокументарных облигаций ООО «Волынь». С некоторыми ООО «Волынь» заключило договоры займа (условием заключения также являлось единовременное и стопроцентное внесение денежных средств), которые не обеспечены облигациями, и, следовательно, страховой защитой.

На данный момент двое руководителей (они же двое из трех учредителей) ООО «Волынь» задержаны, взяты под стражу и находятся под следствием, проходя по двум уголовным делам. Третий учредитель – Мечеслав Демьянко, находясь на свободе, избегает любых встреч с дольщиками, хотя как учредитель он, мы считаем, тоже несет ответственность.

В ходе личных приемов представители власти нам говорят, что не видят путей выхода из сложившейся ситуации. То есть не знают, как нам, дольщикам, получить оплаченные квартиры. Ранее в качестве решения предполагалось, что мы получим не квартиры, а лишь несоизмеримо малую выплату страхового возмещения от БРУПЭИС «Белэксимгарант» (на момент покупки облигаций дольщиками курс 1 доллара был равен 8000 белорусских рублей, сегодня стоимость одного доллара более 15.000 рублей, то есть мы теряем почти половину денежных средств), после чего названный страховщик станет владельцем незаконченного строительством объекта. Более того, в случае возбуждения уголовного дела страховая организация «БелЭксимгарант» вправе отказать нам в выплате страховки (о чем прямо заявил начальник управления страховых и финансовых рисков Д.Л. Якубовский).

Как можно считать такое предложение справедливым решением?

На последней встрече, проходившей в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома (24.07.2015) с участием начальника Главного управления контроля по г. Минску Комитета госконтроля Сергея Бровки и представителей районных администраций и служб горисполкома, мы, дольщики, получили очередной отказ в помощи по решению проблемы. Хотя это есть явное нежелание принять ответственность за **бездействие в течение прошедших лет** и попытку переложить финансовые потери, вызванные этим бездействием, на наши плечи. Как и ранее, **государственные чиновники**, видимо, надеются, что мы просто откажемся от своих законных прав.

А тем временем ситуация уже стала критической.

Из открытых источников стало известно о **продаже за бесценок активов** ООО «Волынь» (акций дочерней организации ОАО «Земля инвестиций») за ... 20 миллионов белорусских рублей. И это при том, что ранее эти активы самим директором ООО «Волынь» оценивались в более десяти миллионов долларов США (согласно предоставленным документам). Как можно было допустить такую сделку? Однако из-за **фактического бездействия органов финансового контроля** срок предъявления претензий по аннулированию сделки купли-продажи активов ООО «Волынь» в виде акций ОАО «Земля Инвестиций» истек, попытки восстановления законных прав дольщиков никто не предпринял.

Вышеназванные органы не обратили внимания и на то, что продажа акций третьему лицу имела лишь номинальный характер. По нашим сведениям, покупатель актива не просто находился в сговоре с руководством ООО «Волынь» в момент сделки, но и по сей день является одним из фактических владельцев ООО «Волынь».

Так чем занимаются компетентные службы – защитой интересов обманутых людей или покрывательством виновников?

В итоге, получив многочисленные отказы от властей (администрации Первомайского района, Мингорисполкома, Администрации президента) и оставшись наедине со своими проблемами, дольщики пытаются привлечь к наболевшей проблеме общественное внимание, придать ей резонанс, надеясь хоть так достучаться до президента. Есть проблема долгостроев, она не снята, она существует!!! Только в Первомайском районе Минска сегодня имеются три таких проблемных объекта.

В качестве примера можно привести мирную акцию протеста дольщиков, которая состоялась 22 июня 2015 года, когда после работы (около 19.00) возле долгостроя по ул.Волгоградской, д.20 собралась небольшая инициативная группа, чтобы от имени дольщиков разместить на заборе наши крики о помощи. Однако последние несколько букв в надписи **«Семьи ждут свои квартиры – нам негде жить»** нанести на растяжку нам не дали. Приехали сотрудники правоохранительных органов с автоматами наперевес и потребовали сорвать ткань, ссылаясь на то, что в Беларуси это незаконно и грозит жертвам долгостроя наказанием за мелкое хулиганство. На просьбу озвучить нормативно-правовой акт, на который ссылался сотрудник милиции, ответа получено не было. Нельзя – и все! В итоге представители власти растяжку сорвали, а дольщиков попросили удалиться.

Что нам теперь делать?! Где искать правду? Как искать правду?

А ведь некоторые ради этого строительства продали ранее имевшиеся квартиры, чтобы самостоятельно, без государственной поддержки, улучшить свои жилищные условия – приобрести квартиры в строящемся доме. Теперь семьи с детьми вынуждены который год ютиться в съемных квартирах, хотя они все оплатили, они никого не обманули. Наоборот, обманули их. Разве это справедливо? Разве такое может быть в правовом государстве?

От имени дольщиков:

Андрей БОСИК
Николай ЧЕМБРОВИЧ
Татьяна БОСИК
Владимир КРАСОВСКИЙ
Людмила САБЛЕВА
Наталья ЖУК
Ольга ГЛАЗ
Александра ЕРЁМЕНКО
Илья ЛЫЧКОВ
Екатерина МЕТЕЛЬСКАЯ
Татьяна СОКОЛОВСКАЯ
Сергей ГРИЩЕНКОВ
Вадим ЯНУКОВИЧ
Иван ДЕНИСЕНЯ
Сергей БОНДАРЕВИЧ
Ольга СТРАШНОВА
Екатерина ФИЛИППОВЕЦ
Евгения САВЧЕНКО
Николай ТИМОФЕЕВ
Мария КАМИНСКАЯ
– всего 107 подписей.

ИЗ АРХИВА

Из ленты новостей 15 декабря 2014 года

Александр Лукашенко потребовал от заместителя председателя Минского горисполкома Виктора Лаптева «именем революции» решить проблему долгостроев в столице. Об этом глава государства заявил в ходе согласования на должность этого чиновника столичной администрации, сообщает пресс-служба президента.

По словам Виктора Лаптева, в Минске строится 172 дома, четыре дома являются проблемными, еще примерно 15 также могут быть проблемными.

«Почему мы приняли исчерпывающие меры, а проблемные дома снова появляются?» – возмутился Александр Лукашенко.

«У нас главы администраций ничем в Минске не занимаются. Я критикую председателей райисполкомов за то, что они слабо шевелятся или им власти не дают, мы с этим разбираемся, но главы администраций в Минске вообще ничем не занимаются!», – заявил Лукашенко.

«Они сегодня практически не у дел. Их нужно задействовать на всю катушку, и прежде всего для контроля и деятельности по недопущению проблем в отношении населения. Считай: ЖКХ, образование, и прежде всего строительство, – сказал белорусский руководитель. – Я не понимаю, как можно создать проблемную стройку сейчас?! Вот я никак не могу понять! Четко все определили: вот отлицензированные предприятия, которые имеют право строить, вот контролер, люди дают деньги, есть договор – выполняйте его!».

«Именем революции, не глядя ни на кого, вы эту проблему должны решать, – потребовал Лукашенко. – Есть тот, кто платит. Я уверен, что люди платят честно, по договору. Есть те, кто должен строить. Боюсь, что там проблемы, у строителей. Именем революции вы должны решить эти вопросы! В противном случае я просто хочу повторить: «Все сядут!»

«Я не допущу больше, чтобы люди обращались к вам, а в голове имели в виду всегда президента, почему нет порядка, а так и бывает, и они правы. Поэтому я использую и крайние методы для наведения порядка», – предупредил Лукашенко минского чиновника.

«Поэтому вы с председателем горисполкома определитесь и договоритесь, чтобы этих проблем не было. Это ваша наиважнейшая задача. Вы знаете, как это делать. Вы пришли из Комитета госконтроля. Читай – честный человек, принципиальный, поэтому действуйте», – сказал Лукашенко, обращаясь к Лаптеву.

ИЗ ПОСЛЕДНИХ НОВОСТЕЙ

Кто до этого довел?

Судьбу объекта незавершенного строительства ООО «Волынь» решит антикризисный управляющий. Об этом корреспонденту агентства «Минск-Новости» рассказал глава администрации Первомайского района Игорь Кудревич.

– Готовность объекта на момент остановки строительства и развала фирмы-заказчика составляла около 6%, – пояснил Игорь Алексеевич. – Способ привлечения заказчиком инвестиций – выпуск жилищных облигаций, а также займы, добровольные пожертвования. Сегодня два учредителя компании находятся под следствием. Мингорисполком выступил с инициативой прохождения процедуры банкротства ООО «Волынь», поскольку общество не выполняет свои обязательства, в том числе по штрафным санкциям за незавершенное строительство. Процедура банкротства началась 17 июля. Что касается судьбы объекта незавершенного строительства, то ее будет решать антикризисный управляющий. Гражданам, чтобы решить свои имущественные вопросы, связанные со строительством, надо обращаться в судебные органы и страховую компанию «БелЭксимгарант», которая застраховала облигации.

ТЭМА ДНЯ

Як мы пераждываем спёку?

Анамальна высокія тэмпературы, якія больш за тыдзень пануюць у Беларусі, сталі выпрабаваннем не толькі для жыхароў краіны, але і для супрацоўнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Што стаіць за такім паняццем, як высокі клас пажарнай небяспекі? Крыху статыстыкі: цягам апошняга тыдня пажар адбыўся ў 95 будынках. Загінулі чатыры чалавекі. Трое атрымалі цяжкія траўмы. Статыстыка сумная. А калі яшчэ ўлічыць, што гарэлі палі з ураджаем і наша асноўнае багацце – лясы?

Абсалютна лагічна на такім фоне выглядае забарона на наведванне лясоў ва ўсіх абласцях краіны. Усё гэта робіцца з адной мэтай – прадухіліць лясныя і тарфяныя пажары і забяспечыць бяспеку людзей. Цяпер дазваляецца праязджаць на аўтатранспарце толькі па дарогах, якія вядуць да населеных пунктаў, а таксама да месцаў, прызначаных і абсталяваных для адпачынку. Распальванне вогнішчаў у лясах і на тарфяніках на гэты перыяд забаронена. На час дзеяння забароны зачыняюцца ўсе шлагбаумы на з'ездах з дарог у лясы.

У выпадку выяўлення парушэнняў правілаў пажарнай бяспекі ў лясах вінаватыя будуць прыцягвацца да адміністрацыйнай адказнасці. Гэта штраф ад 25 да 50 базавых велічынь. Каб зразумець, наколькі цяжка пераносяць спёку людзі, якія маюць праблемы з ціскам, дастаткова бачыць "хуткія" з маячкамі і гучнымі сірэнамі ў горадзе.

Пік спёкі прыпаў на выхадныя. Народ ратаваўся як мог – адны з'язджалі як мага далей (дарога на Нарач нагадвала стужку з аўтамабіляў, лодак на прычэпах, ровараў...), другія – ад самай раніцы падаліся на гарадскія пляжы (ратавальнікі паведамляюць, што ў 99% выпадкаў гібелі ў вадзе вінават алкаголь. Калі гінуць малыя дзеці, то гэта таксама адбываецца па віне бацькоў, якія знаходзяцца нападпітку і не сочаць за імі), а трэція – схаваліся ў сваіх кватэрах, закрыўшы вокны шторамі.

У суботу і нядзелю на мінскіх вуліцах было нешматлюдна. Пашанцавала ЦУМу. Там, па словах прадаўцоў аддзела бытавой тэхнікі, выканалі месячную норму продажу за кошт вентылятараў. Што ж, гэта не дзіўна.

Тым часам сіноптыкі папярэджваюць, што расслабіцца можна будзе толькі напрыканцы тыдня.

Любоў ЛУНЁВА.

НУ И НУ!

От имени «бобруйской мафии»

Бобруйский межрайонный отдел Следственного комитета окончил расследование уголовного дела в отношении двух жителей Бобруйска, выдававших себя за членов криминального сообщества и вымогавших у потерпевшего деньги, лишавших его имущества и использовавших его бесплатный труд в корыстных целях, сообщила официальный представитель управления СК по Могилевской области Оксана Соленюк.

«В период с июня 2009 года по январь 2015 года они неоднократно предъявляли этому человеку требования о передаче им имущества, а также выполнении в их пользу действий имущественного характера. Регулярные напоминания вымогателей сопровождались насилием и угрозами расправы», – проинформировала О.Соленюк. По данным следствия, вымогатели, предъявляя требования к потерпевшему, требовали бесплатно изготовить памятник на могилу отца одного из обвиняемых, стоимостью не менее 600 долларов, предоставить им продукты питания и спиртное. Они также неоднократно требовали приобрести на свое имя в кредит бытовую технику.

Уголовное дело передано прокурору для направления в суд.

СІТУАЦЫЯ

Пра шахматы і не толькі

Беларускія аматары шахмат б'юць у званы, а дырэктара Цэнтра шахмат і шашак узялі пад варту.



Не так даўно ў рэдакцыю завіталі аматары-шахматысты, якія выказалі сваю занепакоенасць "камерцыялізацыяй" Цэнтра шахмат і шашак, а таксама, на іх думку, абыякавым стаўленнем чыноўнікаў да іх.

"Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках (РЦАП) будаваўся не толькі для падрыхтоўкі беларускіх шахматыстаў высокай кваліфікацыі, але і для работы з аматарамі шахмат, – распавёў адзін з шахматных актывістаў **Ігар ГУЛІК**. – *Савецкі Саюз увогуле стаў вялікай шахматнай дзяржавай з-за шырока разгорнутай у краіне работы з аматарамі шахмат, на якіх праходзілі "абкатку" ўсе савецкія чэмпіёны свету. Зараз, у сувязі з камерцыялізацыяй спорту ўвогуле і шахмат у прыватнасці РЦАП практычна поўнасць прыбраў са свайго кола дзейнасці работу з аматарамі шахмат. Гэта ярка праявілася на прыкладзе дзейнасці нашага аматарскага клуба "Ладдзя", які дзейнічае на базе РЦАП ужо больш за 30 гадоў (да апошняга часу клуб узначальваў патрыярх беларускай шахматнай школы Абрам Якаўлевіч Ройзман). Аднак у лютым 2013 г. кіраўніцтва РЦАП не падпісала з Ройзманам працоўны кантракт, і работа клуба на нейкі час "заглохла". Потым Абрама Якаўлевіча вярнулі на нейкую іншую пазаштатную пасаду, але затым і яе скарацілі".*

На думку аматараў шахмат, кіраўніцтва цэнтра больш цікавяць камерцыйныя пытанні, чым праблемы клуба.

"Многія памяшканні будынка арандуюцца арганізацыямі, якія да шахмат і шашак не маюць ніякага дачынення, – дадаюць яны. – *Коцікам тут знаходзіцца месца для выставы, а аматарам шахмат – не. Нам зрабілі мат!"*

Шахматысты звярталіся да міністра спорту і турызму **Аляксандра Шамко**, да памочніка прэзідэнта па пытаннях фізкультуры і спорту **Максіма Рыжанкова.** Апошні, дарэчы, у сваім адказе адзначыў, што клуб "Ладдзя" да гэтага часу не мае юрыдычнага статуса, а ўся іх дзейнасць зводзіцца толькі да правядзення шахматных турніраў і гульняў на дабрачыннай аснове. Прадстаўнікам клуба прапануецца падумаць з Мінгарвыканкамам аб стварэнні гарадскога шахматнага клуба.

Тым часам у нейкім сэнсе тэма "камерцыялізацыі" Цэнтра шахмат і шашак знайшла днямі свой працяг і ў заяве Следчага камітэта Беларусі.

"Завершана расследаванне справы дырэктара Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках, – гаворыцца ў паведамленні. – *43-гадовая мінчанка сістэмна выкарыстоўвала сваё службовае становішча ў карыслівых мэтах. Яна прысвойвала бюджэтныя грошы ў рублях і валюце, якія выдзяляліся яе ўстанове для спартыўных мерапрыемстваў, вучэбна-трэніровачных збораў, на камандзіровачныя выдаткі, у тым ліку на выезд у замежжа. Акрамя таго, дырэктар загадвала работнікам бухгалтэрыі без падстаў налічваць ёй прэміі і матэрыяльную дапамогу, кампенсацыю за нявыкарыстаны адпачынак. Таксама жанчына завалодала будматэрыяламі, якія прадпрымальнікі-арандатары набылі для рамонту аднаго з памяшканняў установы. Ад аднаго з прадпрымальнікаў яна атрымала хабар за працяг арэнды. Следчыя сабралі доказы па 12 злачынных эпізодах. Шкода ад дзеянняў дырэктара ацэньваецца ў суму больш за 222 млн рублёў".*

Экс-дырэктара вінавацяць у злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі, крадзяжы шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, махлярстве і атрыманні хабару.

Мінчанку ўзялі пад варту, на яе маёмасць коштам 1,361 млрд рублёў накладзены арышт.

Такая вось камбінацыя...

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ЧУЛІ?

У продажы з'явіцца самагон

Прамысловую вытворчасць напою пачынаюць на Слонімскім вінаробным заводзе. Прадпрыемства першым у краіне атрымала ліцэнзію на прамысловую вытворчасць самагону.

На заводзе кажуць, што вырабляць будуць два віды гэтага напою: самагон «Традыцыйны» крэпасцю 42 градусы і самагон «Люты» крэпасцю 47 градусаў.

Для вытворчасці самагону Слонімскі вінзавод набыў унікальнае абсталяванне, зробленае пад заказ. Прадстаўнік завода сцвярджае, што іх прадукцыя не мае непрыемнага паху, а пахне хлебам.

Раней легальна самагон у Беларусі выраблялі толькі ў невялікіх аб'ёмах на тэрыторыях этнамузейных комплексаў.

Чакаецца, што новы прадукт будзе прадавацца ў шырокай гандлёвай сетцы, у тым ліку ў крамах бяспошліннага гандлю Duty Free.

Пасажырапаток у Польшчу вырас амаль на чвэрць

Паводле інфармацыі Беларускай чыгункі, у ліпені цягніком у Польшчу дабіралася на 20 працэнтаў больш беларусаў, чым у чэрвені. У БЧ лічаць, што гэтаму паспрыяла змяншэнне коштаў на квіткі больш чым у два разы. Напрыклад, цяпер з Гродна да Беластока і назад можна з'ездзіць усяго за 120 тысяч 155 рублёў.

Паводле інфармацыі БЧ, з пачатку года чыгуначным транспартам у Польшчу было перавезена 104.000 чалавек, з іх практычна 20 тысяч пасажыраў у ліпені.

ФУТБОЛ

Што «свеціць» БАТЭ і мінскаму «Дынама» ў еўракубках?

Беларускім футбольным клубам засталося зрабіць крок да выхаду ў групавыя стадыі еўракубкаў.

Як вядома, барысаўскі БАТЭ пасля перамогі над венгерскім "Відэатонам" выйшаў у 4-ы кваліфікацыйны раўнд футбольнай Лігі чэмпіёнаў, дзе згуляе з сербскім "Партызанам". Першы матч пройдзе ў Барысаве 18–19 жніўня, праз тыдзень каманды пераедуць у Бялград.

Дык вось у нас на паліцы ў камодзе заўсёды стаялі каньяк, гарэлка, віно. Бацька быў непітушчы. Але часта прыходзілі то скульптар Заір Азгур, то крытык Алесь Кучар, то пісьменнікі Пятро Глебка і Пятрусь Броўка. Аднойчы прыходжу дадому са школы, а брат яшчэ не сышоў, яму ў другую змену (мы вучыліся ў беларускамоўнай 25-й паказальнай школе імя Чарвякова, у якой выкладаў Янка Маўр. Цяпер на яе месцы знаходзіцца паштамт). Бачу, Артур каньячок цягне. "Ты толькі нікому не кажы, – просіць ён. – Ад каньяку так добра вершы пішуцца!". Ён быў на пяць гадоў мяне старэйшы, яму ішоў трынаццаты год. Артур – за дзверы, а я за каньяк – і пісаць вершы. Потым адкрыў другую бутэльку...Карацей, прыходзіць мама. Я адчыняю дзверы і падаю. Пабеглі за доктарам, думалі, што шкарлятына. Ніхто не мог дапамагчы. Недалёка ад нас жыў тэрапеўт Сяргей Мелкіх *(пазней член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі)*. Ён агледзеў мяне і кажа: "Дык ён жа п'яны!" Пазней нават падчас вайны не мог піць нават квас. Напіўся на ўсё доўгія гады наперад *(смяецца)*.

«Мне было трынаццаць, калі пайшоў працаваць...»

– Вы згадалі пра вайну. А дзе яе сустрэлі?

– У пісьменніцкім Доме адпачынку, будынак якога знаходзіцца цяпер у Мар'інай Горцы. У шэсць гадзін раніцы 22 чэрвеня я і Ігар Атраховіч, сын Кандрата Крапівы, пайшлі на рыбалку. А побач, ля Пухавіч знаходзілася некалькі ваенных аэрадромаў. Мы шлі па шпалах, і раптам над намі з'яўляюцца два знішчальнікі і пачынаюць страляць. "Во, п'яныя лётчыкі, – кажу я. – Напіліся і прамазалі". Потым бачым: ляціць самалёт з двума фюзеляжамі, а на ім крыжы. Разумеем, нешта не так. Прыбягаем у Дом творчасці, а над намі смяюцца. Маўляў, паніку падымаеце! А неўзабаве з рэпрадуктараў ужо выступаў Молатаў, які паведаміў пра пачатак вайны.

25 чэрвеня прыехаў бацька, Алесь Кучар і Пятрусь Броўка. Яны сказалі, што трэба збірацца, бо Мінск гарыць. Але на чым ехаць? Нашу грузавую машыну на другі дзень забралі ў армію. Затое ў нас было некалькі бочак бензіну. Бацька з Броўкам пайшлі да сакратара Пухавіцкага райкама партыі. Той сказаў, што з машынай дапамагчы не можа. Але побач стаіць машына слонімскага ваенкамата. А ў іх бензіну няма.

Пайшлі дамаўляцца. Тая машына напаўпустая: там сядзяць жонка слонімскага ваенкама і шафёр. На нашых конях пагрузілі бочку бензіну і давезлі да станцыі. Машына прыехала да Дому адпачынку. У палутарку ўбілася чалавек сорак, адзін на адным. Раніцай 26-га паехалі на ўсход па Магілёўскай шашы. Разам з намі ехалі сем'і Барысенкі (дырэктара Інстытута літаратуры і мастацтва), Броўкі, Крапівы, Змітрака Бядулі.

– Без страху і неспадзяванак не абышлося?

– Бліжэй да Магілёва нас спыніў нямецкі патруль. А ў нас у машыне дзве дробнакаліберныя вінтоўкі! На шчасце, іх не ўбачылі. Праверылі нас і прапусцілі. Даехалі да Крычава. Ледзь заехалі ў лес за мостам – апошні разбамбілі. У расійскім горадзе Рослаўлі сустрэлі Уладзіміра Маліна, сакратара ЦК кампартыі Беларусі. Пісьменнікаў пакінулі ў распараджэнні штаба, а сем'і іх (разам са сваякамі саміх сакратароў ЦК) адправілі эшалонамі на ўсход.

Нейкі час жылі ў Саратаўскай вобласці, а потым сем'і пісьменнікаў было вырашана эвакуіраваць у Алма-Ату. Бруд быў такі, што вазы да вакзала цягнулі на сабе. Дабраліся да станцыі, пагрузіліся і паехалі. Страшэнна хацелася есці. Таму там, дзе спыняліся, мянялі якія заўгодна рэчы на хлеб.

Аднойчы спыніліся на станцыі Семіглавы Арол, што ў 12 кіламетрах ад Уральска. Абмен ужо заканчваўся, калі цягнік даў гудок. Змітрок Бядуля захваляўваўся, што цягнік паедзе без яго, і пабег. Мы за ім. Паспелі. А Бядуля любіў пальцамі скручваць махорку, з-за чаго яна станавілася пузатай *(паказвае)*. Я ўвесь час звяртаў на тое ўвагу, бо паліў сам. Бядуля скруціў яе, зацягнуўся некалькі разоў – і яму стала дрэнна. Марыя Ісакаўна, яго жонка, папрасіла: "Гарык, падтрымай". Я падбег, праціснуўся, падтрымаў. Бядуля пачаў задыхацца. І заціх. На маіх руках ён і памёр. Таму мы выгрузіліся ва Уральску, дзе Бядулю і пахавалі.

– Як выжывалі ва Уральску? Вы пайшлі працаваць?

– У гэтым жа горадзе знаходзіўся БДТ-2 (*цяпер Нацыянальны драматычны тэатр імя Якуба Коласа, што працуе ў Віцебску)*. Маці звязалася з тэатрам. Яго супрацоўнікі прыехалі, арганізавалі пахаванне Бядулі, а для нас – інтэрнат. Мне было трынаццаць, і я пайшоў працаваць у БДТ-2 – асвятляльнікам, бутафорам, рабочым сцэны, драпіроўшчыкам, пазней нават акцёрам дапаможнага складу. Людзей не хапала, бо ўсіх мужчын забралі ў армію.

Аднойчы нават выйшаў на сцэну з вялікім Сяргеем Лемешавым. Справа ў тым, што ў 1943-м БДТ-2 перабраўся ў падмаскоўны горад Арэхава-Зуева. А Вялікі тэатр прыехаў туды з "Яўгенам Анегіным". Ідзе спектакль, я стаю за кулісамі. Тым часам масквічы разумеюць, што секунданта для дуэлі, падчас якой Анегін заб'е Ленскага, няма. Бачаць мяне. Даведаліся, хто я такі, і папрасілі дапамагчы. Так і выйшаў на сцэну.

– Пасля вызвалення вы працягвалі працаваць у тэатры?

– У Мінску паспрабаваў уладкавацца ў Купалаўскі тэатр. Але Глеб Глебаў, тагачасны мастацкі кіраўнік, адмовіў: "Развернемся тут, потым падыдзеш". Расказаў пра такі адказ дома. Неўзабаве мая маці сустрэла Глебава ў краме і спытала: "Чаго ты не бярэш майго сына?" Той кажа: "Хай прыходзіць". Маці пагаварыла з Фані Алер, дырэктарам Купалаўскага. Тая таксама была не супраць. Я прыйшоў у Купалаўскі, прынёс даведку, што працаваў у БДТ-2, і ў лістападзе 1944 года мяне прынялі, залічылі акцёрам дапаможнага складу. Іграў маленькія ролі кшталту "Кушать подано".

Праз некалькі месяцаў пры тэатры адкрылася студыя акцёрскага майстэрства. Яе ўзначальваў Еўсцігней Міровіч. Працаваў там і Леў Літвінаў *(рэжысёр, які паставіў легендарную "Паўлінку")*. Паколькі я працаваў у штаце тэатра, іспыты туды не здаваў. Мне зрабілі ліпавую даведку, што я скончыў дзесяць класаў. Хоць у сапраўднасці не было і пяці. Літвінаў быў да мяне больш памяркоўны. А вось Міровіч не ўзлюбіў, бо я быў недысцыплінаваны. Спазняўся, не туды прыходзіў, хуліганіў, не ўмеў выпіць так, каб мяне не заўважылі. Але менавіта Міровіч даў мне першую ролю: іграў скетч *(невялікая п'еса камедыйнага зместу з двума, радзей трыма персанажамі)* са Стэфаніяй Станютай. Ездзілі па вайсковых часцях і выбарчых участках. Вядома, галоўная была Стэфанія, я толькі падыгрываў. Наогул, ведаў Станюту яшчэ з 1930-х гадоў: яна неаднаразова вадзіла мяне малога за руку па скверы.

«Спецслужбы ведалі кожны мой крок»

– Ваша кар'ера ў Купалаўскім была нядоўгай?

– У верасні 1948 года мяне забралі ў армію. Бацька мог дамовіцца, але не хацеў. Ды і я не настойваў. Тады ў армію ішлі з задавальненнем. Школу стралкоў-радыстаў авіяцыі я скончыў з адзнакай "выдатна", таму мог выбіраць ваенную акругу. Выбраў Закаўказскую, бо хацеў пабачыць той рэгіён. У свой час бацька ездзіў туды з пісьменніцкай дэлегацыяй, і ў яго засталіся вельмі яркія ўспаміны.

Мяне накіравалі старэйшым механікам у 104-ю эскадрыллю асобага прызначэння (я скончыў школу авіямеханікаў па радыёспецабсталяванні). Яна базіравалася ў Тбілісі, у раёне Наўтлуг, і падпарадкоўвалася непасрэдна Маскве і камандуючаму ваенна-паветраных сіл Закаўказскай ваеннай акругі. Нашай задачай было выконваць асаблівыя партыйныя заданні на поўдні. Праз іх двойчы давялося пабачыць Сталіна.

– Адчувалі страх?

– Не, хутчэй адчуваў нясмеласць. У 1951 годзе з Масквы была дастаўлена платформа. На ёй – першыя савецкія верталёты Мі-1, але без вінтоў. Мы сабралі тэхніку на аэрадроме і паляцелі на адну з грузінскіх дач Сталіна (здаецца, размешчаную ў раёне Кутаісі). Я з'яўляўся радыстам і механікам. А кіраваў намі Васіль Сталін. Ён мне вельмі спадабаўся: прыемны, без усялякіх "закідонаў". Я працаваў, зашпілены на ўсе гузікі. Было горача, а Васіль мне кажа: ""Старшой", што ты пакутуеш? Расшпіліся і не ўставай, калі я заходжу". Я працаваў сваім пазыўным. Ён кажа: "Працуй маім, лягчэй будзе". Прыляцелі на дачу Сталіна, ён выйшаў, моўчкі паглядзеў. Навошта каменціраваць? Адна "мошкара" перад ім. Гэтаксама лёталі і другі раз, калі прывозілі да Сталіна групу замежнікаў.

– Вас правяралі?

– Спецслужбы ведалі кожны мой крок: да якой дзяўчыны хадзіў учора і з кім піў пазаўчора. Аднойчы здарыўся камічны эпізод. Сядзім у забягалаўцы ў самым цэнтры Тбілісі. Падыходзіць да мяне адзін з саслужыўцаў: "Што пра цябе напісаць? Начальнік асобага аддзела даў каманду". "Напішы, што люблю Маякоўскага. А што пра цябе напісаць?" *(смяецца)*.

– Каго вы яшчэ запомнілі з крамлёўскіх небажыцеляў?

– Бачыў усіх. Нават Лаўрэнція Берыю. Але што тут расказваць? Для іх мы фактычна з'яўляліся абслугай, на якую не звяртаюць увагі. Лепш раскажу, як паканфліктаваў з Молатавым. У 1960-я прыехаў у Маскву у госці да Вячаслава Броўкіна *(у 1960–1962 гадах – галоўны рэжысёр Купалаўскага тэатра, пазней рэжысёр трынаццаці серый тэлесерыяла "Следствие ведут знатоки")*. Яго не было дома, таму выйшаў на вуліцу. Прызнаюся, да таго крыху выпіў. Бачу, ідзе дзядзечка. Сівы, з жоўтым тварам. Вусы такія, як у мяне. З ім пад руку бабуля. Гляджу – дык гэта Молатаў, якога ўжо адправілі на пенсію! Падыходжу да яго: "Вячаслаў Міхайлавіч! Як вашы сталінскія дарогі вядуць да камунізму?". Справа ў тым, што ў нашай эскадрыллі вісеў плакат, на якім быў намаляваны Молатаў. І надпіс: "Мы ідзём у той век, калі ўсе сталінскія дарогі вядуць да камунізму". Молатаў на мяне паглядзеў: "Малады чалавек, вядзіце сябе прыстойна!" Я яму ў адказ: "Але ж я памятаю, як глядзеў на ваш партрэт!" Нарэшце яго жонка Паліна Жамчужына не вытрымала: "Малады чалавек, супакойцеся, дайце нам спакойна ісці!" Тут падбягае Броўкін: "Вячаслаў Міхайлавіч, прабачце!" Тыя і пайшлі.

– Пасля арміі вы вярнуліся ў Купалаўскі?

– Прыйшоў у тэатр, а там ніводнай вакансіі! У дадатак я захварэў, узніклі праблемы з голасам. Працягваць акцёрскую кар'еру не было сэнсу. А хадзіць з падносамі і пісталетамі не хацелася. Нейкі час быў беспрацоўны. Потым уладкаваўся на "Гарызонт". Калі сталі выпускаць першыя тэлевізары, уваходзіў у брыгаду настройшчыкаў. З'яўляўся сакратаром камітэта камсамола завода, пазней сакратаром парткама Мінскага паліграфкамбіната. А пасля сустрэў Іосіфа Дорскага, якога прызначылі дырэктарам кінастудыі "Беларусьфільм". Ён мяне запрасіў у сваю каманду. Паколькі знаходзіўся ў наменклатуры партыйных органаў, давялося ўзгадняць прызначэнне з Сяргеем Прытыцкім. Працаваў на "Беларусьфільме" амаль тры дзесяцігоддзі.

– Чым вы асабліва ганарыцеся?

– У 1976-м я стварыў студыю мультфільмаў, якую ўзначальваў дванаццаць гадоў. Адразу паставіў умову, каб ніхто не ўмешваўся ў маю працу. Таму студыя развівалася. Цяпер многія рэжысёры пакрысе з'язджаюць за мяжу. Галоўны камплімент пачуў праз гады ад былых падначаленых: "Калі вы прыйдзеце на "Беларусьфільм", эфектыўнасць працы павялічыцца ў тры разы". Адказваю: "Дык я ўжо не ў стане працаваць і кіраваць". "А гэта не трэба. Адной ваша прысутнасці дастаткова". Здаецца, гучыць нядрэнна...

Максім ПЛОТНІКАЎ.
Фота аўтара і з сайта belapan.com.

МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ!

«Дармаедам» прапануюць здацца


360 тысяч рублёў могуць сэканоміць грамадзяне, якія самастойна аплацяць падатак на «дармаедства». 10-працэнтную зніжку ўвяло Міністэрства па падатках і зборах.

Новая мера дзейнічае з 1 жніўня 2015 года па 1 ліпеня 2016 года. Грамадзяне, якія да 31 мая 2016 года паведамяць у падатковую па месцы жыхарства пра свой «няўдзел у фінансаванні дзяржвыдаткаў», заплацяць на 360 тысяч менш за астатніх «дармаедаў». Замест 3,6 млн рублёў ім давядзецца заплаціць 3 млн 240 тысяч рублёў. Аплаціць гэты дзяржаўны збор можна ў любым банку краіны ці аддзяленні сувязі.

Астатнім так званым «дармаедам» падатковая ўручыць паведамленне на аплату збору за 2015 год да 1 кастрычніка 2016 года. Падатак без зніжкі трэба будзе заплаціць у бюджэт да 15 лістапада 2016 года.

БОЛЬШАЯ СЦЕНА

Макс Корж объявил о своем турне



Белорусский исполнитель, который первый из отечественных артистов собрал самую крупную площадку Беларуси – Минск-Арену» (в 2013 году на его концерт «Жить в кайф» пришло 15 тысяч зрителей) и собирает аншлаги на крупнейших площадках СНГ, на днях на своей странице «В контакте» сообщил:

– Я рад, что вам уже не надо объяснять, что такое «Большой флэт», писать, что будет эпичное шоу с кучей света и звука, ибо это уже само собой разумеется. Хочу вам сказать лишь одно: я не знаю, как это у нас получилось, но то, что происходило в прошлом ноябре, безусловно, достойно еще более сильнейшего повтора. Перед ноябрем мы еще расскажем, как вам подготовиться, что с собой захватить. Мы будем работать сообща, ведь самое главное на этих тусах – это вы и ваш танцпол, который в самый пик тех концертов был самым настоящим произведением искусства. А пока начинаем скидываться бабками и, чтобы залы не забились зеваками, подтягиваем на тусу только самых вырванных друзей и подруг, ведь каким будет БОЛЬШОЙ ФЛЭТ 2, зависит только от вас, и от того, кого вы с собой приведете».

В Минске концерт состоится 28 ноября во Дворце спорта. Также Макс Корж выступит в Киеве (7 ноября), во Львове (8 ноября) и 21 ноября в Санкт-Петербурге.

ТЭНІС

Зноў па-за топ-20

Менш за месяц прабыла Вікторыя Азаранка ў дваццатцы наймацнейшых тэнісістак свету. У апублікаваным 10 жніўня рэйтынгу ВТА спартсменка апусцілася з 19-га на 21-е месца.

У топ-20 спартсменка вярнулася 13 ліпеня пасля дзесяцімесячнага перапынку. Сезон-2015 яна пачынала на 31-м месцы, а 2 лютага апусцілася на 49-ты радок, што стала самым нізкім паказчыкам пасля 8 ліпеня 2007 года. У лік 40 наймацнейшых спартсменка вярнулася 2 сакавіка, у топ-30 – 11 мая.

РЭГІЁН

Адбудуем сваю Беларусь!



Зусім нядаўна гэты каменны крыж, вышынёй 230 см, усталяваны каля сядзібы Сяргея Панкрацьева ў вёсцы Янова Гарадоцкага раёна. Паводле звестак старажылаў, прыблізна тут ён калісьці і стаяў. Дакладных звестак аб тым, калі быў зрынуты крыж, ніхто з мясцовых жыхароў не паведаміў. Але мяркуючы па звычайнай практыцы абыходжання з такімі помнікамі ў нашай краіне, ён быў павалены за савецкім часам, калі праводзілася супрацьрэлігійная кампанія. Доўгі час павалены крыж знаходзіўся на ўзбочыне, потым быў закапаны ў палатно дарогі, адкуль яго і дастаў спадар Сяргей, паставіўшы за мэту ўсталяваць крыж там, дзе ён стаяў спрадвеку.

Дарэчы, праз Янова праходзіла вядомая з XII стагоддзя дарога з Віцебска на Полацк. У пазнейшыя часы яна перакрыжавалася з дарогай Бычыха – Полацк. Тут жа гэтыя сухапутныя шляхі перакрыжоўваліся з ракой Бярноўкай. Гэта і ёсць адна з падстаў, паводле якой менавіта на гэтым месцы ў старыя часы быў пастаўлены гэты крыж.

Ён, дарэчы, цалкам не даследаваны. Бо побач знаходзіцца камлыга з выбітымі петрогліфамі ў выглядзе стрэлмаланак і паловы сферы. А значыць, гэта могуць быць і атрыбуты пахавання.

Яшчэ адна версія – тут было язычніцкае свяцілішча...

Але што б там ні было, стары крыж вярнуўся на сваё месца, на ахову зямлі і людзей.

Міхаіл ПАЎЛАЎ.

ХОББИ

Иван СПОСОБОВ: «Ищу деньги для Высоцкого»



Минчанин Иван Способов хочет, чтобы в Минске установили мемориальную доску, посвященную памяти Владимира Высоцкого. Со своей инициативой он уже обошел немало чиновничьих кабинетов.

– В Мингорисполкоме мне сказали так: найдете деньги – установим, – *рассказал Иван Способов «Народной Воле».* – Мне кажется, было бы правильным повесить мемориальную доску на улице Веры Хоружей, там, где раньше находился клуб «Реактор» – до развала Советского Союза в этом здании был актовый зал проектного института, в котором прошло семь концертов Владимира Высоцкого.

За чей счет будет установлена доска? Я намерен обратиться в Федерацию профсоюзов с официальной просьбой о финансировании – предварительно мы уже обсуждали эту идею. Еще вариант – бюджет Союзного государства. Ну и в конце концов можно открыть счет и собирать деньги, как говорится, с шапкой по кругу. Чтобы спроектировать, сделать и установить такую доску из бронзы, понадобится около 200–250 миллионов белорусских рублей. Если выбрать самый дешевый вариант, то можно, конечно, и сэкономить. Но мне кажется, нужно делать так, чтобы эта доска как минимум 50 лет провисела. Одним словом, ищу деньги для Высоцкого.

По словам Ивана Способова, в этом году в Беларуси пройдет немало мероприятий, посвященных Высоцкому.

– В октябре в Бресте состоится первый международный фестиваль бардовской песни имени Владимира Высоцкого, – *анонсирует мероприятие Способов.* – С такой инициативой выступили местные жители, неравнодушные к его творчеству. Среди них – главный редактор газеты «Брестский курьер» Николай Александров. А накануне фестиваля в старейшей гостинице города сделают музей Высоцкого, под который оборудуют один из номеров, в котором останавливался артист, когда бывал в Бресте.

Руководство «Буга» также обратилось в горисполком с предложением установить в сквере возле гостиницы памятник Владимиру Высоцкому. Проект был поддержан. Правда, возводиться памятник будет не за деньги городского бюджета. И сроки появления памятника зависят от потенциальных инвесторов и жертвователей, заинтересованных в реализации этого проекта.

Сегодня памятник известному барду стоит в Новогрудке.

– Высоцкий вместе с Мариной Влади около двух недель жил под Новогрудком во время съемок фильма «Сыновья уходят в бой», – *уточняет Способов.* – За ночь написал четыре песни для этого фильма.

Иван Способов о Высоцком может говорить часами. Сейчас он пытается создать в Минске общественный центр Владимира Высоцкого.

– По образованию я философ, но так получилось, что почти 20 лет отработал на МАЗе простым рабочим, – *рассказывает Иван Способов о себе.* – Я сам впервые увлекся Высоцким, когда мне было около 20 лет. Какой-то солдатик пел его песни под гитару, и меня зацепило. А по-настоящему я начал изучать творчество Владимира Высоцкого с 1986 года, а в 2005 году создал минский городской киноклуб Высоцкого.

Значительную часть своих доходов Способов вкладывает в свое хобби, что не всегда находит понимание у родственников.

– Мобильного телефона у меня нет, – *говорит Иван Иванович.* – Поскольку я пенсионер, у меня очень скромные доходы, и я стараюсь экономить. Значительную часть своих доходов вкладываю в Высоцкого: провожу концерты, различные встречи, мероприятия. Что говорит моя супруга по этому поводу? Среди моих родственников нет ни одного человека, который разделял бы мои интересы. И жена категорически против. Она считает, что Высоцкий алкоголик, многоженец и наркоман. Но, видя, насколько я увлечен Высоцким, она, похоже, уже смирилась...

Марина КОКТЫШ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
11 ЖНІЎНЯ 2015 г.

КУХНЯ КРАІН ЕЎРАПЕЙСКАГА САЮЗА

Венгрыя

Гуляш



Мабыць, самай вядомай вугорскай стравай можна назваць мясны гуляш і яго варыянт з бульбай, прыгатаваны ў кацялку. Само слова «гуляш» (венгры скажуць «гуйяш») перакладаецца як «пастух». Густы, вельмі востры суп з рознымі дадаткамі быў звыклай ежай венгерскіх жывёлаводаў. Варылі яго на вогнішчы ў чыгунным чане ў перапынках паміж перагонамі. Рэцэптаў гуляшу ў Венгрыі – вялікае мноства, як і самiх прыхільнікаў гэтай знакамітай стравы. Распавядаюць, што ў ранейшыя часы нават гусары рассаджваліся не па чыне, а па тым, хто які гуляш любіць.

Інгрэдыенты (на 6–7 порцый):

Лапатачная частка ялавічыны – 450–500 г
Цыбуля – 2 шт.
Бульба – 3–4 шт.
Салодкі перац – 1–2 шт.
Часнок – 1 зубчыка.
Перац чылі – 1 шт.
Мясны булён – 1 літр
Папрыка – 3 ст. лыжкі
Топленае сала або раслінны алей для смажання
Кмен – па гусце
Соль – па гусце.

Падрыхтоўка:

1.Дробна нарэзаную цыбулю абсмажце і выкладзіце ў чыгунны кацялок або глыбокую каструлю.

2.Вымытую і абсушанную ялавічыну нарэжце буйнымі кубікамі, абсмажце ў патэльні на вытапленым сале або раслінным алеі, перакладзіце ў кацялок. Дадайце сечаны часнок, кмен, трохі вады ці мяснога булёну і тушыце 1,5 гадзіны.

3.Ачысціце бульбу буйнымі кубікамі, складзіце яе ў кацялок. Туды ж палажыце балгарскі перац, нарэзаны саломкай, папрыкі і ўліце мясны булён.

4.У амаль гатовы суп дадайце дробна нарэзаны перац чылі. Пасаліце, давядзіце да кіпення, зменшыце агонь і варыце яшчэ каля паўгадзіны. Гатовай страве дайце добра настаяцца.

У Венгрыі добраму госцю кажуць: Jó étvágyat! (Йоо этваадьот).



Рэкамендацыя: падаюць гуляш з клёцкамі (чіпетке). Часам у яго дадаюць памідоры і таматную пасту, але сапраўдны гуляш рыхтуецца без гэтых прадуктаў. Колер і насычаны смак стравы надаюць чырвоны перац і папрыка.

ПО ПОВОДУ

Да разве сердце позабудет...



30 июля 2009 года перестало биться сердце замечательного человека, футболиста и тренера Юрия Анатольевича Курненина.

Но память о нем жива и будет жить! Курненина помнят друзья, футболисты, ученики и, конечно, болельщики со стажем.

Автор этих строк ни в коем случае не претендует на звание друга Юрия Анатольевича, но был знаком с ним в те годы, когда работал администратором футбольных раздевалок стадиона «Динамо», а Курненин был игроком этого клуба. И хочу сказать, что это был порядочный, честный и принципиальный человек. Уважающий окружающих его людей.

Юрий Анатольевич всю свою жизнь отдал любимому делу – футболу. Многие годы играл в составе минского «Динамо». Провел 315 матчей, забил 25 голов. Чемпион СССР (1982 г.), бронзовый призер (1983 г.), финалист Кубка СССР (1987 г.). Это был атакующий защитник-универсал! Он несколько лет входил в список 33 лучших футболистов Союза. После окончания московской Высшей школы тренеров перешел на тренерскую работу.

С 2006 года – главный тренер молодежной сборной Беларуси.

Бронзовый успех белорусской «молодежки» на Евро-2011 в Дании с ее перевоплощением в олимпийскую сборную – это и триумф Курненина!

Награжден Почетным знаком белорусской федерации футбола (2002 г.) и знаком «Почетный динамовец Беларуси» (2007 г.).

Мы, болельщики-ветераны, с огромной душевной благодарностью вспоминаем Юрия Анатольевича. Уверен, что память о нем будет жить, пока в нашей стране будут любить и играть в футбол.

Юрий ЯСИНСКИЙ, ветеран спорта, заслуженный тренер Беларуси.

НЕСТАНДАРТ

В Витебске есть команда незрячих футболистов

Они не видят ни поля, ни партнеров по команде, ни мяча. По правилам этого вида спорта игроки выходят на площадку в повязках на глазах. На зрительских трибунах соблюдается полная тишина, а футболисты должны обозначать свое местонахождение. Корреспондент «Народной Воли» побывал на тренировке незрячих футболистов в Витебске.





Спорт не для всех

Мини-футбол для инвалидов категории B1 (полностью незрячие игроки) включен в список Паралимпийских видов спорта. Первые тренировки витебские футболисты начинали как любители в 2008 году. Сейчас сборная Беларуси состоит в основном из витебских спортсменов, за исключением игроков из Гродно и Молодечно. Последние несколько лет футболисты представляют Беларусь на профессиональных международных турнирах.

– *Категории B2-B3 – это слабовидящая группа спортсменов, у нас категория B1* – объясняет специфику игры тренер команды **Олег Кириллов**. – *Мяч, которым играют ребята, – звуковой, и с его помощью футболисты ориентируются на площадке.*

В команде ФК «Витебск» 8 спортсменов. Тренировки три раза в неделю, также в обязательном порядке посещение тренажерного зала и бани. По словам Олега Кириллова, послаблений и поблажек своим футболистам он не делает, так как это в дальнейшем отразится на результате.

– *Не все парни могут самостоятельно добраться до стадиона,* – рассказывает Олег Константинович. – *И это проблема. Хорошо, что есть парни, которые немного видят и в состоянии добраться сами и еще помочь другим товарищам по команде, а мы уже их около стадиона подхватываем...*

Многие родственники незрячих игроков негативно настроены по отношению к футболу. Боятся, что в процессе тренировки можно получить травму, поэтому доехать до стадиона помогают единицам. Как признается главный тренер, родители предпочитают, чтобы человек находился в четырех стенах и редко выходил на улицу, нежели занимался спортом.

– *Еще год назад Дима Холодович не умел плавать,* – Олег Кириллов показывает на разминающегося парня в желтой футболке. – *Но после регулярных походов в бассейн сейчас он проплывает 1000–1200 метров. Зрение он потерял в 4 года и на улице практически не появлялся, но у него был потенциал, который можно было развивать...*

Мяч – «погремушка»

На футбольной площадке во время матча игроки проводят два тайма по 25 минут. Команда состоит из пяти человек: четыре игрока и зрячий вратарь, который так же, как и тренер, находящийся за воротами, может руководить и координировать действия футболистов.

Обязательное условие – повязка на глазах. Мяч напоминает «погремушку» – внутри находятся небольшие подшипники. К слову, мячи для команды еще одна проблема – в Беларуси пока нет производства инвентаря для незрячих спортсменов, поэтому приходится заказывать из Европы за немалые деньги.

– *Первый год тренировок был очень сложным,* – вспоминает Олег Кириллов. – *Много времени понадобилось, чтобы ребята научились ориентироваться на площадке и чувствовать мяч.*

На зрительских трибунах в течение всего матча сохраняется полная тишина, а футболисты обязаны комментировать свои действия и местонахождение, громко произнося слово «Вой» («Иду»).

По словам Олега Кириллова, спорт для ребят – не только возможность выходить из квартиры, но и шанс создать семью и найти себя в обществе.

– *Ситуация каждого футболиста индивидуальна,* – говорит Олег Константинович. – *Капитана сборной Юрия Ардынова хотели перекупить у нас французы, предлагали гражданство... А всего несколько лет назад он жил в неотапливаемом общежитии. Спорт изменил его жизнь...*

– *Сейчас у меня новая квартира, я женился, родился сын,* – подключается к разговору Юрий Ардынов. – *Вообще, у нас всего пару ребят из команды холостые, а так все семейные... Но и у этих все впереди.*

Без проблем не бывает

Кроме футбольных тренировок у некоторых игроков есть основная работа, так как прожить на пенсию в размере 2–2,5 миллиона сложно. Как признаются сами спортсмены, трудоустроиться человеку с ограниченными возможностями в нашей стране очень трудно. В основном работают инструкторами в специализированных центрах для инвалидов или методистами по культурно-массовой работе.

– *В центре я обучаю людей компьютерной грамоте,* – рассказывает Дмитрий. – *Ведь, когда человек лишается зрения, он попадает в новый и незнакомый для него мир и всему нужно учиться заново.*

По словам футболистов, чувствовать себя равными, несмотря на инвалидность, в сегодняшнем обществе не получается. Проблем хватает: начиная от неработающего уже несколько лет звукового светофора и заканчивая организацией и финансированием футбольной команды.

– *За границей паралимпийцы занимаются по два раза в день, получают зарплату, имеют отдельное финансирование,* – говорит Олег Кириллов. – *То есть уровень принципиально другой, но мы играем с ними и показываем результат.*

Проблем у спортсменов действительно хватает. Участие в конкретном турнире напрямую зависит от финансирования, которое оставляет желать лучшего.

– *Конечно, проблемы есть, и они будут,* – говорит Олег Константинович. – *Надежда на лучшее всегда есть, и руки мы не опускаем. В первую очередь эти ребята – спортсмены, а только потом инвалиды. Но чтобы стать спортсменом, каждый из них должен преодолеть немалое количество барьеров...*

По окончании тренировки на футбольной площадке Олег Кириллов и его команда спешат в зал. По расписанию сегодня еще занятия на тренажерах и баня.

– Отдых у вас бывает? – по пути интересуюсь у **Дмитрия Холодовича**.

– Да, с августа у нас каникулы, а в сентябре новый сезон... Я в Германию на днях улетаю...

– Зачем, если не секрет?

– Познакомился с девушкой по скайпу...


– Один в Германию?!

– Да. Это не первая самостоятельная поездка за границу. Без трудностей не обходится, конечно, но в этом вся суть, когда нужно принять решение за долю секунды...

Роман ВАСЮКОВИЧ.
Фото автора.

ШАШКІ

Дзіцячы трэнер



Ім з'яўляецца кандыдат у майстры спорту з Гродна Міхаіл Стэфановіч. На занятках ён выкарыстоўвае вучэбныя прыклады са сваёй багатай практыкі. Вось адзін з іх:

Белыя: b2, c7, d2, d6, h2 (5).

Чорныя: b4, e3, e5, f4, g5 (5).

Выйгрыш. Пераканайцеся ў гэтым самастойна.

Канчатковыя вынікі

Яны падведзены ў міжнародным конкурсе, які быў прысвечаны 100-годдзю славутага расійскага стваральніка шашачных задач М.М.Пустыннікава. Наймацнейшымі ў ім прызнаны: Дзмітрый Камчыцкі з Магілёва – у раздзелах эцюдаў і міні-праблем-64, Аляксандр Кагоцька з Бабруйска і Мікалай Бароўнік з Мазыра – адпаведна ў жанрах праблем-64 і задач-100. Д.Камчыцкі яшчэ заняў 2-е месца па складанні дамачных праблем-100. Вызначыўся і Аляксандр Шурпін з Клімавічаў (2-е і 3-е месцы па задачах-100 і 64). Мінчане Віктар Шульга і Мікалай Ляшкевіч атрымалі ўзнагароды за трэція прызавыя месцы ў намінацыях эцюдаў і міні-праблем-64.

Памяці Іванова

На вялікі жаль, пайшоў з жыцця наш даўні чытач Барыс Іваноў. Нарадзіўся ён у 1950 годзе, закончыў БДУ па спецыяльнасці "Матэматыка". Другую вышэйшую адукацыю атрымаў у Маскоўскім універсітэце па тэорыі музыкі. Адначасова захапляўся старадаўняй гульнёй і ўвайшоў у сусветны рэйтынг вядучых праблемістаў. Яго манера стварэння камбінацый, эцюдаў і задач спадабалася рашальнікам. У першынствах краіны па шашачнай кампазіцыі мінчанін заваяваў 5 залатых медалёў, па 3 – сярэбраных і бронзавых. За высокія дасягненні ў гэтай спартыўнай дысцыпліне Міністэрства спорту і турызму прысвоіла яму ганаровае званне нацыянальнага майстра, а Міжнародная федэрацыя шашак – майстра ФМЖД.

Маэстра таксама вядомы як суддзя, трэнер, калекцыянер шашачных кампазіцый. Падрыхтаваў адзін з першых варыянтаў кодэкса па іх складанні. Актыўна займаўся прапагандай старадаўняй гульні: вёў шашачны клуб "Олимп", выдаў кнігу "Шашачная кампазіцыя. Сучасны погляд".

Разгледзьце канструкцыі, якія знакамітымі аўтарамі прысвячаюцца светлай памяці Б. Іванова:

1 (Пётр Матус, Мінск). **Белыя**: 12, 14, 19, 22, 23, 37, 41, 43, 48, 49, 50, дамкі 5, 16, 18 (14). **Чорныя**: 35, 39, 45, дамкі 34, 36, 47 (6). Замкнуць дзве простыя чорных: 31, 38 (47:24:46А) 44, 40, 40#. А (47:20:46) 42, 1, 41, 28, 44#.

2 (Аляксандр Кагоцька, Бабруйск). **Белыя**: b6, c5, c7, e5 (4). **Чорныя**: a5, e3, f4, g3 (4). Малютка мае два кампазіцыйныя варыянты: 1. d8 (c7A) a5, h2+. A (b4) h4, a3+.


Праверце рашэнні

"Павучальныя эпізоды": **№1** (М.Семянюк – А.Плакхін) – 1. fe3 fg3 2. bc5! 3. gf2 4. b:f6 і белыя захапілі ініцыятыву ў эндшпілі.

Мікалай ГЛАДКІ.

СЛЫШАЛИ?

Скарлетт Йохансcон – самая красивая женщина мира



Одна из самых востребованных актрис в Голливуде стала победительница рейтинга самых красивых женщин по версии **Google.** Правда, составители рейтинга умолчали о том, какие алгоритмы они использовали для его формирования, а значит, рейтинг самых красивых женщин мира может быть субъективным.

В тройке красоток мира также Айшвария Рай – актриса и модель из Индии, которая еще в 1994 году завоевала титул Мисс Мира и голливудская звезда Анджелина Джоли, которая в этом году, к слову, отметила 40-летие.

СКАНДАЛ

Честный спортсмен обречен на поражение?

Каждая третья медаль у бегунов под сомнением

Телекомпания ARD и газета The Sunday Times обнародовали шокирующие данные: анализ проб на допинг легкоатлетов в период с 2001 по 2012 годы выявил более 800 подозрительных случаев, сообщает dw.com.

1 августа немецкий общественно-правовой телеканал ARD показал документальный фильм «Секретное дело о допинге: в царстве теней легкой атлетики» («Geheimsache Doping: Im Schattenreich der Leichtatletik»). В основу фильма легли протоколы анализов крови ведущих легкоатлетов мира, проведенных Международной федерацией легкой атлетики (МФЛА) в период с 2001 по 2012 годы. Эти секретные документы из анонимного, как он уверяет, источника получил спортивный редактор ARD Хайо Зеппельт (Hajo Seppelt).

ARD совместно с британской газетой The Sunday Times попросил известных австралийских экспертов Робина Парисотто и Майкла Эшендена провести анализ 1200 проб крови 500 бегунов, участвовавших в чемпионатах мира и Олимпийских играх в указанный срок. Речь идет о средних и длинных дистанциях – от 800 метров и до марафона. Робин Парисотто свидетельствует: «Я еще никогда не видел столь пугающих анализов крови. Складывается впечатление, что многие спортсмены остались безнаказанными». У 800 бегунов эксперты выявили подозрительные показатели. Среди них, если верить экспертам, 146 спортсменов, завоевавших медали на Олимпийских играх или чемпионатах мира.

Россия и Кения – чемпионы по допингу?

МФЛА подтверждает, что протоколы анализов крови – подлинные. Однако как они оказались в руках журналистов, не знает. Сам Хайо Зеппельт объясняет это так: «После показа первого фильма по ARD я получил много указаний и писем по электронной почте из России и других стран о допинге в легкой атлетике и других видах спорта. Реакции Международной федерации легкой атлетики тоже подталкивали меня к дальнейшим расследованиям».

Первый двухсерийный фильм, о котором говорит Хайо Зеппельт, назывался «Как Россия делает своих победителей». В нем утверждалось, что ряд российских спортсменок и экспертов принимают допинг. Сразу после показа ленты в декабре прошлого года российские функционеры с негодованием отвергли все обвинения. В частности, тогдашний президент Всероссийской федерации легкой атлетики (ВФЛА) Валентин Балахничев назвал фильм «провокацией». ВФЛА подала в суд иски о защите репутации к авторам фильма. Тем не менее уже в январе Балахничев подал в отставку.

В новом фильме Зеппельт и его соавторы не ограничились Россией, а побывали в Кении и привезли, как они утверждают, доказательства широкого употребления допинга кенийскими бегунами. Есть в списке подозреваемых и спортсмены из Великобритании и Германии. Но все-таки лидер – Россия. Министр спорта РФ Виталий Мутко заговора именно против России в новом фильме не увидел. В интервью агентству ИТАР-ТАСС он заявил: «Этот скандал не касается России, он касается мировой системы легкой атлетики. А кто-то пытается выставить второй фильм так, что мы в этой системе чуть ли не главные игроки... Видимо, какие-то люди хотят погубить легкую атлетику, выпуская такие фильмы».

Честный спортсмен обречен на поражение

Другие политики и спортивные функционеры придерживаются иного мнения. Глава Немецкой федерации легкой атлетики Клеменс Прокоп (Clemens Prokop) подчеркивает: «Обвинения, выдвинутые в фильме, пугают. С другой стороны, это только подозрения, как указывается и в самом фильме. А подозрения – это еще не доказательства».



Главную ответственность Клеменс Прокоп возлагает на МФЛА. Президент Международного олимпийского комитета (МОК) Томас Бах (Thomas Bach) не считает, что расследование скандала входит в компетенцию МОК.

Международная федерация легкой атлетики в свою очередь пытается уйти от ответственности. Ее президент, сенегалец Ламин Диак (он, кстати, уже в этом месяце покинет свой пост), видит за разоблачениями заговор с целью «перераспределить медали».

Его заместитель, в прошлом знаменитый украинский прыгун с шестом Сергей Бубка, который претендует на пост президента МФЛА, занял принципиальную позицию: «Мы не приемлем нарушений правил. Каждому должно быть ясно, что обманщикам нет места ни в легкой атлетике, ни в других видах спорта, ни в олимпийском движении».

В Германии допинг будет уголовно наказуем

Правительство Германии еще в конце марта этого года подготовило законопроект об уголовном наказании за допинг. После обсуждения в бундестаге он может вступить в действие еще в 2015 году. У законопроекта двоякая цель – защита здоровья спортсменов и устранение нечестной конкуренции в спорте.

Документ предусматривает наказание до трех лет лишения свободы за применение допинга, торговлю соответствующими препаратами или их назначение по рецепту. До десяти лет грозит тем, кто подвергает опасности «значительное число людей», либо «подвергает опасности жизнь и здоровье» спортсмена».

Министр юстиции Германии Хайко Мас (Heiko Maas) в интервью газете Der Tagesspiegel подчеркивает, что последние разоблачения лишний раз подтверждают важность такого нормативного акта, поскольку «внутренний контроль и наказания со стороны спортивных организаций проблему не решили».

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул. Энгельса, 34а.
Прыёмная:
тэл./факс (017) 3286871.
Тэл. рэкламнага аддзела:
(017) 3286609
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info

9 772071 964000 15062

Падпісныя індэксы: 63222 – для індывідуальных падпісчыкаў, 632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, правы ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 10.08.2015 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 25450 экз. Заказ №3005.